

Фотарэпартаж Відэа

Парафіяльны адпуст у гонар святой Ганны адбыўся ў Лучаі 26 ліпеня. Свята, прысвечанае ўспаміну бабулі Езуса, маці Найсвяцейшай Панны Марыі, сабрала вернікаў, каб паўдзельнічаць ва ўрачыстай Святой Імшы. разам з ксяндзом біскупам Алегам Буткевічам. Былі запрошаны святары: ксёндз дэкан Раман Мурзіч з Параф'янава, ксёндз пралат Мечыслаў Янчышын дэкан з Глыбокага, святары з Мінска і Славакіі і суседніх парафій. Асаблівае месца сярод запрошаных належала славутаму зямляку: сыну Лучайскай зямлі, сакратару Апостальскай нунцыятуры ў Казахстане, капелану Яго Святасці, кс. др Аляксандру Рагіню. Дасягнуўшы такіх вышыняў у маладым узросце, святар з'яўляецца гонарам не толькі Лучая, але і ўсёй краіны.













Сяброўкі Дзіяніс і Кацярына (злева) з вёскі Лучаі ўжо не першы год удзельнічаюць у фэсце, а Міхаіл Пяшчарэвіч – выканаўца-віртуоз



Яго канцэрт плаўна перайшоў у незабыўнае фаер-шоў, якое зачаравала гледачоў.

